ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ
МІЖНАРОДНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ
ІМЯ А. Д. САХАРАВА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА
КАРЭЛІЦКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

# КАРЭЛІЧЫ І КАРЭЛІЦКІ РАЁН: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

*Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі*

г. п. Карэлічы, 13 снежня 2024 г.

Мінск
«ІВЦ Мінфіна»
2025

*Аляксандр Горны*

## МІКРАГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА РУХУ Ў МІЖВАЕННАЙ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ: АКТЫВІСТЫ ЖУХАВІЦКАЙ ГМІНЫ

На сучасным этапе развіцця гістарычнай навукі многія даследчыкі пачынаюць актыўна выкарыстоўваць мікрагістарычны падыход у вывучэнні розных грамадскіх працэсаў ці гістарычных падзей. Мікрагісторыя, якая пачала развівацца ў еўрапейскай гістарыяграфіі пасля Другой сусветнай вайны, займаецца разглядам малых тэрыторый і папуляцый (мястэчка, вёска, асобная сям'я) мінулага з мэтай вывучэння паўсядзённага жыцця і ментальнасці «маленькага чалавека» — тых людзей, на якіх гісторыкі фактычна не звярталі ўвагу, аддаючы перавагу вядомым палітычным фігурам ці прывеліяваным слаям грамадства. У той жа час, дзякуючы мікрагістарычнаму падыходу не толькі даследуецца невялікая супольнасць людзей на пэўнай тэрыторыі, але і асэнсоўваюцца, нібыта «пад мікраскопам», больш шырокія заканамернасці развіцця грамадства. У беларускай гістарыяграфіі даўно наспела патрэба выкарыстання такога падыходу ў даследаванні розных маштабных грамадскіх працэсаў, якія можна падзяліць на мікрачасткі і даследаваць кожную асобным чынам. Такім працэсам, напрыклад, можа быць беларускі нацыянальны рух у міжваеннай Заходняй Беларусі, які ахопліваў сотні тысяч актывістаў у розных рэгіёнах. У дадзеным артыкуле якраз у рамках мікрагістарычнага падыходу была зроблена спроба стварыць калектыўны партрэт актывістаў беларускага руху ў пэўнай мясцовасці — вёска Вялікія Жухаічы і навакольныя населеныя пункты, якія цяпер уваходзяць у склад Карэліцкага р-на, а ў міжваенны перыяд складалі Жухавіцкую гміну.



Жухавіцкая гміна як адміністрацыйная адзінка была ўтворана на тэрыторыі былой Мінскай губ. у 1920 г. у часы польска-савецкай вайны польскімі акупацыйнымі ўладамі. Пасля Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. гміна з'яўлялася часткай Нясвіжскага павета Навагрудскага ваяводства. 13 студзеня 1926 г. паводле распараджэння Савета міністраў Польшчы, Жухавіцкая гміна была ўключана ў склад Стаўбцоўскага павета, дзе і знаходзілася фактычна да 1939 г[1]. Значнымі населенымі пунктамі гміны з'яўляліся вёскі Вялікія Жухавічы, Малыя Жухавічы, Лукі, Кожава і інш. Згодна з перапісам насельніцтва Польшчы 1921 г., у гміне пражывала 7143 чал., сярод іх беларусаў было 4778 (67 %), палякаў — 2336 (32,7 %), а таксама невялікую частку складалі яўрэі і рускія[2]. Разам з гэтым, у гміне налічвалася 6430 чал., якія вызначылі сваё веравызнанне як праваслаўныя. Улічваючы цесную сувязь канфесійнай і этнічнай ідэнтычнасці ў заходніх рэгіёнах Беларусі, можна дапусціць, што частка этнічных беларусаў-праваслаўных па нейкіх прычынах назвалі сваю нацыянальную прыналежнасць як польскую, альбо былі запісаны так удзельнікамі перапісу насельніцтва. Заўважым, што многія даследчыкі лічаць матэрыялы перапісу 1921 г. неаб'ектыўнымі і заніжанымі адносна нацыянальных меншасцей тагачаснай Польшчы.

Як і розныя іншыя рэгіёны Заходняй Беларусі, у міжваенны перыяд Жухавіцкую гміну не абмінуў і беларускі нацыянальны рух. У 1926 г. у Стаўбцоўскім павеце пачалі стварацца гурткі Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ),

[1] *Насевіч В.* Стаўбцоўскі павет / В. Насевіч. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 6, кн. 1. — Мінск, 2001. — С. 420.

[2] Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej. — T. VII, cz. I, Województwo nowogródzkie. — Warszawa, 1923. — S. 46.



pawet.net

якіх пад канец года налічвалася 63[3]. У 1927–1932 гг. дзейнічала Мірская акруговая управа Таварыства беларускай школы (ТБШ), у межах якой працавалі гурткі ў Стаўбцоўскім павеце, у тым ліку і ў Жухавіцкай гміне[4]. Напрыклад, вядомым дзеячам дадзенай структуры ТБШ з'яўляўся жыхар вёскі Вялікія Жухавічы Аляксандр Грушэўскі. Актывісты гэтай арганізацыі ладзілі беларускія тэатральныя пастаноўкі, распаўсюджвалі нацыянальную прэсу і літаратуру, збіралі дэкларацыі на адкрыццё беларускіх школ і інш. Акрамя гэтага, на тэрыторыі Жухавіцкай гміны дзейнічалі падпольныя ячэйкі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), якія ўваходзілі ў склад розных падраённых камітэтаў. У рамках названых структур беларускага руху была задзейнічана значная колькасць мясцовых актывістаў, ураджэнцаў Жухавіцкай гміны, асноўныя характарыстыкі якіх паспрабуем разглядзець ніжэй.

Для аналізу калектыўнай біяграфіі актывістаў беларускага руху ў Жухавіцкай гміне намі былі выкарыстаны крыніцы справаводчага характару, якія захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці. Гэта анкеты, падрыхтаваныя польскай паліцыяй у 1930-я гг. на мясцовых удзельнікаў беларускага руху для службовага карыстання[5]. У асноўным гэта былі сябры гурткоў БСРГ, ТБШ і падпольных ячэек КПЗБ у Жухавіцкай гміне. Для правядзення дадзенага даследавання было выкарыстана 33 анкеты, у якіх утрымліваліся асноўныя біяграфічныя звесткі актывістаў, іх фота, звесткі аб палітычнай дзейнасці, звесткі аб затрыманнях і судовых пакараннях і інш. Дакументы напісаны на польскай мове, у іх маюцца пазнакі на рускай мове, зробленыя, магчыма, прадстаўнікамі савецкіх

[3] *Палуян У.* Беларуская сялянска-рабочая грамада / У. Палуян. – Мінск, 1967. – С. 88.

[4] *Вабішчэвіч, А.* Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. Вабішчэвіч. –Брэст, 2008. – С. 41, 54.

[5] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 664. Воп. 2. Спр. 6. Арк. 1–193.



спецслужбаў ужо пасля 1939 г. Дадзеныя крыніцы даюць шырокае ўяўленне пра матэрыяльны стан, адукацыю, тэрытарыяльную мабільнасць, праследаванне ўдзельнікаў беларускага руху ў асобнай канкрэтнай мясцовасці на прасторах тагачаснай Заходняй Беларусі.

Калі казаць пра матэрыяльную забяспечанасць, то ў большасці сваёй беларускія актывісты ў Жухавіцкай гміне былі не надта заможнымі сялянамі, ва ўласнасці якіх было толькі ад 1,5 да 5 га зямлі. Некаторыя дзялілі гэтую зямлю з бацькамі ці братамі, што яшчэ больш пагаршала іх маёмасны стан. Сустракаліся, аднак, сярод жухавіцкіх актывістаў і больш заможныя гаспадары. Так, кіраўнік гуртка ТБШ у в. Хлюпічы Жухавіцкай гміны Ілля Шут валодаў 10 га зямлі, а кіраўнік раённага камітэта КПЗБ у Малых Жухавічах Канстанцін Корзан меў гаспадарку на 12 га зямлі[6]. Тым не менш, нават і гэтыя лічбы не маглі ісці ў параўнанне з зямельнай уласнасцю, напрыклад, польскіх асаднікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Так, адна сям'я асадніка ў Навагрудскім ваяводстве магла мець ад 15 да 45 га зямлі[7]. Такое рэзкае адрозненне ў маёмасным стане магло быць істотным матывам для мясцовых сялян далучацца да беларускага руху, асабліва да яго левaрадыкальнай плыні, якая выказвала антыдзяржаўныя лозунгі па зямельным пытанні і заклікала скасаваць асадніцтва ў Заходняй Беларусі.

У разглядаемых крыніцах вельмі цяжка выявіць дакладны ўзрост актывістаў, аднак можна ўсталяваць, калі яны далучыліся да дзейнасці беларускіх арганізацый. У большасці сваёй гэта былі маладыя хлопцы 20–30 гадоў, дата нараджэння якіх прыпадае на пачатак 1900-х гг. Ёсць сярод іх і людзі 1870-х ці

[6] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 664. Воп. 2. Спр. 6. Арк. 65, 108.

[7] *Полуян В.* Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. / В. Полуян, И. Полуян. – Минск, 1962. – С. 26.

1880-х гг. нараджэння, на момант далучэння да беларускіх арганізацый ім было 40–50 гадоў, але такіх адзінкі. Нягледзячы на тое, што па распаўсюджанай думцы ў сялянскім асяроддзі сем'і ствараліся ў вельмі маладым узросце, актывісты Жухавіцкай гміны асабліва не спяшаліся ў шлюб: амаль палова з 33 актывістаў былі нежанатыя. Значная колькасць нежанатых прыпадала на ўраджэнцаў 1910-х гг., якія далучыліся да беларускага руху ў 1930-я гг. ва ўзросце 20 і больш гадоў. Тыя, хто быў жанаты, мог мець ад 2 да 4 дзяцей. Найбольшая колькасць дзяцей — шэсць — была ў «ветэрана» жухавіцкіх актывістаў Канстанціна Рокаша, 1877 г. нараджэння, які ў 1926 г. пачаў арганізоўваць мясцовыя гурткі БСРГ[8]. Важнай асаблівасцю можа быць тое, што наяўнасць сям'і і вядзенне цяжкай сялянскай гаспадаркі не перашкаджалі гэтым людзям займацца грамадскімі справамі і мець ад гэтага клопат з боку ўлад у выглядзе праследаў і турэмных зняволенняў.

Розным быў адукацыйны ўзровень беларускіх актывістаў з Жухавіцкай гміны. Сярод іх толькі 4 чалавека мелі нясконачаную сярэднюю ці сярэднюю адукацыю. Заўважым, што гэта былі навучэнцы беларускіх гімназій (Віленскай беларускай гімназіі і Клецкай беларускай гімназіі), сярод адзначаных актывістаў не было ніводнага вучня польскай сярэдняй установы адукацыі. Адзін з пераліку — Аляксандр Юшко — пасля заканчэння Віленскай беларускай гімназіі нелегальна пераехаў у Чэхаславакію, там атрымаў вышэйшую адукацыю і застаўся жыць, таму ніякай асаблівай ролі на развіццё нацыянальных працэсаў на радзіме ён не аказваў. У 7 беларускіх дзеячаў з Жухавіцкай гміны была хатняя адукацыя, адукацыйны ўзровень астатніх 22 чалавек вагаўся ў межах 2–5 класаў пачатковай польскай школы ці школы часоў Расійскай імперыі. Цікавай акалічнасцю з'яўляецца тое, што найбольш актыўныя дзеячы

---

[8] ДАГВ. — Ф. 664. Воп. 2. Спр. 6. Арк. 62.



беларускага руху ў Жухавіцкай гміны, у прыватнасці сакратар гуртка ТБШ у Малых Жухавічах і арганізатар аматарскіх пастановак С. Мамончык альбо старшыня гуртка ТБШ у Хлюпічах Ілля Ясевіч, мелі ўсяго толькі хатнюю адукацыю[9]. Гэта не перашкодзіла ім стаць лідарам думак у сваёй мясцовасці і арганізатарамі культурна-асветніцкага жыцця.

Складовай часткай біяграфій беларускіх актывістаў у міжваеннай Польшчы былі арышты і праследаванні з боку ўладаў. Польская адміністрацыя на так званых «крэсах усходніх» фактычна стварыла такую сітуацыю, калі любая праява беларускай нацыянальнай актыўнасці лічылася «камуністычнай дзейнасцю» і падвяргалася абсервацыі з боку паліцыі ці спецслужбаў. Быць беларускім актывістам у Заходняй Беларусі значыла цесна сутыкнуцца з ператрусамі, затрыманнямі і фіксацыяй у паліцэйскіх дакументах, што вельмі звужала пэўныя жыццёвыя магчымасці для гэтых людзей, напрыклад, працаўладкаванне, далейшую вучобу і г. д. Дадзеная акалічнасць бачна і на прыкладзе Жухавіцкай гміны. Сярод 33 мясцовых актывістаў большасць, а менавіта 19 чалавек (58 %), прайшлі праз затрыманні, арышты і судовыя пакаранні. Трое з іх — Сяргей Мамончык, Васіль Ясюк, Лаўрэнцій Бурок — за нацыянальную дзейнасць былі асуджаны на 4-хгадовыя тэрміны і адбывалі пакаранне ў знакамітай польскай турме для палітзняволеных Вронкі[10]. Для такой невялікай лакальнай супольнасці, як Жухавіцкая гміна, такія характарыстыкі былі даволі значным паказчыкам, які адлюстроўваў маштаб рэпрэсій з боку польскіх уладаў адносна ўдзельнікаў нацыянальнага руху.

Пры аналізе дадзеных анкет можна вылучыць шэраг цікавых і змястоўных фактаў. Напрыклад, сярод асаблівых прыкмет актывіста КПЗБ з в. Лукі Жухавіцкай гміны Васіля Шчары

---

[9] ДАГВ. — Ф. 664. Воп. 2. Спр. 6. Арк. 13, 26.
[10] Тамсама. — Арк. 13, 17, 74.

ў анкеце згадвалася наступнае: «насіць беларускую кашулю»[11]. Калі ўлічыць, што ў іншых дзеячаў такой прыкметы не было, можна меркаваць, што насіць беларускую «вышыванку» было прынцыповай пазіцыяй гэтага чалавека, тым самым падкрэсліваючы сваю нацыянальную ідэнтычнасць. Некалькі іншых актывістаў былі затрыманы паліцыяй 11 ліпеня 1933 г. за тое, што спявалі гімн «Ад веку мы спалі», які быў вельмі папулярны ў Заходняй Беларусі сярод удзельнікаў нацыянальнага руху[12]. Звернем увагу на дату гэтай акцыі — 11 ліпеня, якая ў савецкай Беларусі лічылася дзяржаўным святам, прымеркаваным да дня вызвалення Мінска ад польскіх войск у 1920 г. З гэтага факта можна зрабіць выснову, што палітычная пазіцыя гэтых людзей праяўлялася ў сімвалічным шанаванні даты, найбольш набліжанай да антыпольскага дыскурсу і разумення польскай улады як «чужой». Таксама можна дапусціць, што дадзеныя актывісты ўжо мелі пэўны вобраз савецкай Беларусі як «сваёй» дзяржавы з пэўным наборам памятных дат і грамадскіх рытуалаў, сфарміраваных агітацыяй левацыдыкальных структур.

У якасці прыкладу прывядзём некалькі біяграфій найбольш выбітных дзеячаў з Жухавіцкай гміны. Значную актыўнасць сярод мясцовай супольнасці праяўляў Сяргей Мамончык, жыхар вёскі Малыя Жухавічы. Ён меў хатнюю адукацыю, быў жанаты, выхоўваў двух дзяцей і валодаў 3 дзесяцінамі зямлі. У 1926 г. Мамончык быў скарбнікам мясцовага гуртка БСРГ, пасля сакратаром гуртка ТБШ. Актыўна займаўся арганізацыяй беларускіх тэатральных прадстаўленняў у навакольных вёсках. У 1928 г. падчас парламенцкіх выбараў у Польшчы агітаваў за беларускі левацыдыкальны спіс «Змаганне за інтарэсы работнікаў і сялян». За сваю нацыянальную дзейнасць быў арыштаваны ў 1932 г., асуджаны на 4 гады турмы, адбыў

[11] ДАГВ. – Ф. 664. Воп. 2. Спр. 6. Арк. 31.
[12] Тамсама. Арк. 140, 153.



увесь тэрмін у турме Вронкі і вызвалены ў 1936 г. Апошні запіс у анкеце С. Мамончыка датуецца студзенем 1939 г., калі ён па рашэнні стаўбцоўскага павятовага старасты быў выселены з памежнай зоны і пераехаў у Ліду. Як склаўся далейшы яго лёс на сённяшні час невядома[13].

Падобны жыццяпіс меў ураджэнец Малых Жухавіч Васіль Ясюк. З 1926 г. ён быў актыўным дзеячам гуртка БСРГ, пасля ТБШ, арганізаваў у сваёй вёсцы беларускі кааператыў «Змаганне», два разы перасякаў мяжу з БССР для атрымання падпольнай літаратуры. У 1932 г. ён быў асуджаны на 5 гадоў, якія адбыў у вронкаўскай турме. Як і Мамончык, В. Ясюк быў выселены з памежнай зоны ў 1939 г.[14] Таксама вядомай асобай у гміне, на якую польская паліцыя завяла анкету, быў Аляксанр Грушэўскі, жыхар вёскі Вялікія Жухавічы. Ён з'яўляўся актывістам ТБШ, уваходзіў у структуры Мірскага акруговага камітэта, агітаваў за адкрыццё беларускіх школ, ладзіў тэатральныя прадстаўленні[15].

Такім чынам, дзякуючы выкарыстанню мікрагістарычнага падыходу можна скласці калектыўны партрэт актывіста беларускага руху ў невялікай лакальнай супольнасці, карэлюючы гэтыя высновы для іншых рэгіёнаў Заходняй Беларусі. У сваёй большасці актывістамі былі маладыя мужчыны 20–30 гадоў, праваслаўнага веравызнання, нежанатыя альбо з невялікай сям'ёй. Яны валодалі маленькімі зямельнымі надзеламі, мелі дастаткова нізкі адукацыйны ўзровень, які дапаўняўся хатняй адукацыяй — хутчэй за ўсё чытаннем беларускамоўнай ці рускамоўнай вучэбнай літаратуры. Моцны ўплыў на гэтых людзей аказвалі левацыдыкальныя арганізацыі, сябрамі якіх у асноўным яны і былі (БСРГ, КПЗБ, ТБШ). Аналіз

[13] ДАГВ. – Ф. 664. Воп. 2. Спр. 6. Арк. 13–16.
[14] Тамсама. Арк. 74–77.
[15] Тамсама. Арк. 51–52.

дзейнасці маленькай супольнасці дазваляе прасачыць наколькі моцнымі былі рэпрэсіі з боку польскіх улад, калі большая частка актывістаў падвяргалася таму ці іншаму праследаванню. У той жа час аналіз вышэй адзначаных крыніц прыводзіць да важнай высновы: мара пачынальнікаў беларускага руху ў пачатку XX ст. аб пашырэнні нацыянальнай свядомасці ў сялянскіх масах фактычна была рэалізавана ў міжваенны час у Заходняй Беларусі. Менавіта ў гэты перыяд беларуская вёска сутыкнулася з моцнымі працэсамі пашырэння нацыянальнай ідэнтычнасці і разумення ўласнай дзяржаўнасці, якія ўжо нельга было спыніць.



*Ирина Олиферук*

# ВИЗУАЛЬНЫЕ ИСТОЧНИКИ ПО ИСТОРИИ КУЛЬТУРЫ ЕВРЕЕВ НОВОГРУДСКОГО ВОЕВОДСТВА (1921–1939 гг.)

После заключения Рижского мирного договора 1921 г. как часть Польского государства было создано Новогрудское воеводство. В состав воеводства с центром в городе Новогрудок входили Барановичский, Воложинский, Вилейский, Лидский, Новогрудский, Несвижский, Слонимский и Столбцовский поветы (позже присоединили Щучинский повет). Городами воеводства были Новогрудок, Барановичи, Лида, Несвиж, Слоним, Столбцы, Щучин, Воложин.

Новогрудское воеводство в 1921–1939 гг. представляло собой регион проживания различных этнических и религиозных сообществ. Большинство населения составляли белорусы, евреи и поляки; по вероисповеданию — православные, католики и иудеи[1]. В 1931 г. в Новогрудском воеводстве 52 % населения разговаривало на польском языке, 39 — на белорусском, 7 % — на идише и иврите; по вероисповеданию преобладало православное население (51 %), католики составляли 40, а иудеи 8 % от всего населения. В городах, как правило, евреи составляли

[1] *Мась, В. А.* Нацыянальны і рэлігійны склад насельніцтва Навагрудскага ваяводства на перапісах 1921–1931 гг. / В. А. Мась // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., Гродно, 5–6 июня 2003 г. / Учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» ; отв. ред. У. Д. Розенфельд ; редкол.: Г. Н. Щелбанина, Н. Н. Беспамятных, С. В. Донских. — Гродно: ГрГУ им. Янки Купалы, 2003. — Ч. 2. — С. 48.